# ПАМЯТКІ

## ЯК ДАВАЦЬ ВЫЗНАЧЭННЕ ПАНЯЦЦЮ

Вызначыць паняцце — значыць адказаць на пытанне «Што гэта такое?».

1. Падбярыце агульнае (радавое) паняцце.
2. Знайдзіце адметную (відавую) прыкмету.
3. Складзіце фармулёўку вызначэння.

Напрыклад, *абсалютная манархія — гэта форма праўлення (радавое паняцце), пры якой улада належыць аднаму чалавеку (відавая прыкмета 1) і перадаецца ў спадчыну (відавая прыкмета 2)*.

## ЯК ХАРАКТАРЫЗАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ АСОБУ

1. Вызначце храналагічны перыяд і галіну грамадскага жыцця, да якіх адносіцца дзейнасць гістарычнай асобы.
2. Апішыце гістарычныя ўмовы, у якіх дзейнічала гістарычная асоба.
3. Ахарактарызуйце вынікі дзейнасці гістарычнай асобы, спосабы і сродкі дасягнення гэтых вынікаў.
4. Ацаніце, які ўнёсак гістарычнай асобы ў гісторыю, у развіццё грамадства; якія наступствы яе дзейнасці для перыяду, які вывучаецца, і сучаснасці.

## ЯК ДАВАЦЬ АЦЭНКУ ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКТУ

1. Дайце кароткую характарыстыку гістарычнаму факту, які вы ацэньваеце (што, калі і дзе адбылося).
2. Устанавіце прычыны факта і зацікаўленасць у ім тых ці іншых сацыяльных груп.
3. Ахарактарызуйце вынікі, наступствы і значэнне гістарычнага факта для яго ўдзельнікаў і для далейшага гістарычнага развіцця.
4. Вызначце гістарычны характар факта (прагрэсіўны, рэгрэсіўны).
5. Сфармулюйце ўласнае меркаванне пра гістарычны факт. Аргументуйце яго.

## ЯК ВЫЯЎЛЯЦЬ ПРЫЧЫННА-ВЫНІКОВЫЯ СУВЯЗІ ПАМІЖ ГІСТАРЫЧНЫМІ ФАКТАМІ

1. Дайце кароткую характарыстыку гістарычным фактам, паміж якімі выяўляеце прычынна-выніковыя сувязі (што, калі і дзе адбылося).

2. Вызначце, якія з разгляданых фактаў з'яўляецца прычынай, а які — вынікам.

3. Высвятліце храналагічныя, лагічныя сувязі паміж гістарычнымі фактамі.

4. Пабудуйце «ланцужок» разважанняў, які тлумачыць сувязь паміж гістарычнымі фактамі.

## ЯК ПАРАЎНОЎВАЦЬ ГІСТАРЫЧНЫЯ ФАКТЫ

1. Вызначце пытанні (крытэрыі), паводле якіх будзеце параўноўваць гістарычныя факты (план параўнання).

2. Дайце характарыстыку фактам, якія параўноўваеце, па кожным пытанні.

3. Вылучыце агульныя характарыстыкі фактаў, якія параўноўваеце, і адрозненні. Зафіксуйце іх у выглядзе вывадаў.

4. Параўнанне гістарычных фактаў лепш праводзіць у форме табліцы:

| Пытанні (крытэрыі) для параўнання | Факты, якія параўноўваюцца (падзеі, з'явы, працэсы) | |
|---|---|---|
| | 1-ы факт | 2-і факт |
| | | |
| | | |

## ЯК АРГУМЕНТАВАЦЬ СВАЁ МЕРКАВАННЕ ПА НЕЙКІМ ПЫТАННІ

1. Вызначце, які вывад вы будзеце аргументаваць. Сфармулюйце яго.

2. Назавіце факты, якія пацвярджаюць слушнасць вывада.

3. Аргументуйце, г. зн. растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж прыведзенымі фактамі і меркаваннем.

## ЯК УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ДЫСКУСІІ (АБМЕРКАВАННІ)

1. Перад тым як выступіць, вызначце сваю пазіцыю. Пераканайцеся ў тым, што вы дакладна разумееце сутнасць праблемы.

2. Уважліва слухайце апанента і толькі потым прадстаўляйце свой пункт погляду.

3. Крытыкуйце не саміх апанентаў, а іх ідэі. Сачыце за тым, каб не скажаць іх думкі і словы.

4. Найлепшы спосаб доказу або абвяржэння — факты. Найлепшы спосаб пераканаць праціўніка — дакладная аргументацыя і логіка. Кажыце коратка, выразна, сваімі словамі і па сутнасці.

5. У працэсе дыскусіі ўдзельнікі могуць змяняць сваю пазіцыю пад уздзеяннем прыведзеных фактаў і аргументаў.

6. Галоўнае ў дыскусіі — не перамога ў спрэчцы, а новыя веды.